2 лица: «Мой папа – герой. А ты?» (Голованов Л.), «Ты вернул нам жизнь!» (Иванов В.) и др.; притяжательные местоимения: «Наше дело правое. Враг будет разбит» (Гершаник Н.), «Моя любовь с тобой, мой храбрый воин!» (Голованов Л.) и др.; повелительное наклонение глаголов: «Не болтай, враг слушает!» (Конашевич В.), «Освободи!» (Дени В.) и др.; побудительные предложения: «Овладевай оружием» (Астапов И.), «Защищай свой город, свой дом» (Петров Г.) и др.; обращения: «Боец! Освободи Белоруссию!» (Жуков Н.), «Трактористы и шоферы! Экономьте горючее!» (Яковлев Н.) и др.). 4. Эмотивность (восклицательные предложения: «Трое против двадцати семи!» (Долгоруков Н.), «Слава Героям Отечественной войны!» (Кучеров А.) и др.). 5. Своеобразие (лексемы, характерные для СССР: «Военный комиссар – отец и душа своей части», «Комсомолец, будь героем Великой Отечественной войны!» (Мальцев П.) и др.). 6. Образность (метафора: «Стальной лавиной раздавим врага» (Одинцов В.), «Мы злому врагу все отрежем пути…» (Кукрыниксы) и др.; языковая игра: «Терем-тюремок», «Аттестат зверости» (Кукрыниксы) и др.; пословицы и поговорки: «Что с воза упало, то пропало!» (Кирсанов Н.) и др.; сравнение: «Трактор в поле – что танк в бою» (Иванов В.), «Как львы, дрались советские пограничники…» (Тоидзе И.) и др.). Учащаяся А. Швайко пришла к выводу: именно вышеперечисленные языковые средства использовались для воздействия на человека, читающего текст плаката.

Таким образом, организация исследовательской внеурочной деятельности учащихся способствует воспитанию у них гражданско-патриотических, духовно-нравственных ценностей.

Список использованных источников

1. Бондарик, К. Модель антисемьи в рассказе А. П. Чехова «Анна на шее» / К. Бондарик // Христианские ценности в культуре современной молодежи : материалы IV Междунар. студен. науч. конф., Минск, 27 окт. 2017 г. / ред.-сост. : С. И. Шатравский, С. А. Юшкевич. – Мн. : Изд. центр БГУ, 2017. – С. 240–242.

2. Адамович, Д. «Белорусский» ли «Гоголь» Ян Барщевский? / Д. Адамович, И. Берестень // Мой первый шаг в науку: тезисы докладов 73-й научно-технической конф. учащихся, студентов и магистрантов, Минск, 21–25 марта 2022 г. / редкол. А. В. Лихачева [и др.]. – Мн. : БГТУ, 2022. – С. 132–133.

3. Родина-Мать зовет! Плакаты Великой Отечественной войны [Изоматериал] : каталог коллекции Белорусского государственного музея истории Великой Отечественной войны / сост. Г. В. Павловская. – Мн. : Літаратура і мастацтва, 2010. – 224 с.

4. Кругликова, Н. П. Языковые средства плаката: семантический и прагматический аспекты: дис. ... канд. филол. наук : 10.02.04 / Н. П. Кругликова. – СПб, 2005. – 177 с.

## ФАРМІРАВАННЕ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ НАВУЧЭНЦАЎ МОЎНЫМІ СРОДКАМІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПАЭЗІІ А. ПЫСІНА)

**Прахарэнка Л.В., МДПУ імя І.П. Шамякіна**

Развіццё новых грамадскіх адносін у цяперашні час непазбежна выдзвігае праблему маральнага фарміравання асобы сродкамі мастацкай літаратурнай мовы. Выдатныя ўзоры выкарыстання лексічных рэсурсаў роднай мовы адзначаюцца ў творах А. Пысіна. Мова твораў паэта ўздзейнічае на чытача эстэтычна, раскрывае перад ім свет прыгожага.

Як вядома, Аляксей Васільевіч – удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Аднак вершаў пра вайну не пісаў амаль дзесяць гадоў, бо жудасна было ўспамінаць тыя падзеі.

Герой ваеннай лірыкі паэта на працягу ўсяго наступнага жыцця лічыць сябе часцінкай баявога братцва, помніць баявых таварышаў – жывых і паўшых. Адсюль узнікае метафара-перыфраза *пайсці ў сваю дывізію.*

Палім мы маршанску махорку,
Бачым мы Дняпроўскую граду.

МГПУ им. И.П. Шамякина

Будзе сёння бой. На тым узгорку,
Можа, я таксама ўпаду.
Я гляджу на даўняе курганне,
На траву, на рыжых мурашоў.
Ведайце: калі мяне не стане –
*Я ў сваю дывізію пайшоў* [1, с. 180].

Рэалістычнае ўспрыняцце жыцця, пільная ўвага да кожнага слова-сродку, паэтычна-вобразнага адлюстравання рэчаіснасці паказвае паэту часта арыгінальнае выкарыстанне семантычных варыянтаў слова, наданне яму новага адцення, магчымасць развіць яго выяўленчы патэнцыял.

На дарозе дажджынак іртуць,
Белы вырыс шпітальнай сцяны;
Ноччу ў сне інваліды вайны
Зябка ў маршавых ротах ідуць [1, с. 190].

Прыслоўе *зябка* ўступае ў спалучэнні з дзеясловамі *пацісnуць* (плячамі), *захінуцца* (у шынель), *ссутуліцца* (ад холаду) і г. д. У дадзеным жа выпадку *зябка ідуць* – аўтарская знаходка. Звычайна *ідуць рухава, хутка, лёгка, асцярожна, бодра* і г. д.

Знаходкам вобразных сродкаў А. Пысіна, здаецца, няма мяжы. У кожным вершы можна заўважыць праяўленне творчай фантазіі, якая выяўляецца ў знаходжанні патрэбнага слова, напоўненага яркімі адценнямі яго семантыкі:

Раскінуў пляж дрымотныя пасцелі,
Падушкі-схілы над Дняпром.
Стрыжы пад самы космас паляцелі,
Туды, дзе рэактыўны гром [1, с. 72].

У гэтым прыкладзе, па сутнасці, *пляж* (пясчаны бераг ракі) мае перайменаванне *(дрымотныя пасцелі),* гэтыя пасцелі па знешнім выглядзе – схілы, якія ўяўляюцца падушкамі. Азначэнне *дрымотныя* нагадвае пра санлівасць пляжнікаў. У цэлым уяўляееца жаркі летні дзень, сінь Дняпра і прыманлівы пясчаны бераг. Пра светласць і бязмежжа паветранага акіяна сведчыць высокі ўзлёт стрыжоў – *пад самы космас,* на ўзровень палёту рэактыўнага самалёта. Для дасягнення мэты, паўнаты выражэння пачуццяў і адэкватнай псіхічнай рэакцыі чытача паэт карыстаецца (і нярэдка) накапленнем сінанімічных граматычных сродкаў. І не важна ўжо, свядома ці інтуітыўна гэта атрымоўваецца:

Шмат *прайсці, зрабіць* яшчэ хацелі,
І з сабой нічога не ўзялі;
Можа, два ці тры асколкі ў целе
Пад дзірван панеслі ў глыб зямлі [1, с. 78].

Такая фігура маўлення ў паэтычнай мове – плеаназм граматычны – з’яўляецца канцэнтраваным сродкам выкладу думак, сцвярджэннем важнасці моманту, дзеяння, здарэння:

…Кажуць, што грыбамі лес завалены, –
– ну, *збірайся, пойдзем* жа хутчэй [1, с. 79].
*Шуміць, гудзе* рака дарогі
Паміж адхонаў і лясоў.
Алень на ўзлессе вынес рогі
Прыйшоўшы ў госці да ласёў [1, с. 80].
Бы ўпершыню гляджу на свет,
Бы назаўсёды пакідаю;
Вясну *вітаю,*
*Абдымаю*
У цішы пялёсткаў і ракет [1, с. 150].

Параўнанне, параўнальныя звароты – важны сродак моўнага выражэння:

МГПУ им. И.П. Шамякина

Сцяжынка на радзіму,
*Як нітка без вузла.*

Вось яно, пысінскае параўнанне. Колькі трэба прайсці жыццёвых дарог, пераадолець цяжкасцей, каб так, адным назоўнікавым словазлучэннем, выказаць усю глыбіню вялікага сэнсу чалавечага быцця, шчымлівага пачуцця прывязанасці да родных мясцін. Дарога дадому – лёгкая, хоць можа быць і доўгаю, ухабістаю ці якой іншай па фізічнай характарыстыцы [1, с. 203]. Надзвычай па-сучаснаму гучаць паэтычныя радкі А. Пысіна пра добры і благі пачатак у чалавеку, які з'яўляецца неадрыўнай часцінкай жывога свету, пра неабходнасць абачліва адносіцца да прыроды як асновы і будучага існавання чалавецтва:

Добрае даецца не аднекуль,
І благое – не ад цёмных траў.
Даўнюю зласлівасць к чалавеку
Шчанюком прымае ваўкадаў [1, с. 225].

Эпітэт *цёмных* (траў) выступае з новым значэннем: *атрутных, ядавітых.* А першыя два радкі можна лічыць крылатым выразам, афарызмам. Гэта вынік назіральнасці і глыбокага аналітычнага асэнсавання жыцця чалавека і прыроды. Паэзія А. Пысіна, як сцвярджаюць літаратуразнаўцы, – гэта паэзія памяці. Па складу мыслення ён – “прадстаўнік медытатыўнай лірыкі, інтэлектуальны пры знешняй прастаце паэт” [2, с. 58]. Станаўленне паэта ішло павольным крокам. Ён не спяшаўся выносіць на агляд свае думкі, пачуцці, перажыванні і імкненні, свой погляд на праявы жыцця, часу. Вялікая патрабавальнасць да сябе, адказнасць за выказанае слова, сціпласць і цвёрдая ўпэўненасць гучаць з вуснаў ужо сталага паэта:

Філолагам вядома сутнасць слоў
І залежы ўсіх моўных анамалій.
А я зноў бачу глыбіню пластоў,
Што мы лапатай і штыком капалі [1, с. 145].

Так, філолагамі многа зроблена ў такой складанай, загадкава-таямнічай і прыцягальнай грамадскай з’яве, як мова. У тым ліку вызначаны і сродкі, якія дапамагаюць пісьменнікам ствараць яркія вобразы і праз іх выяўляць сваю ацэнку жыццёвых фактаў, свае адносіны да іх. Творчае выкарыстанне ўстойлівых зваротаў мовы з’яўляецца вельмі ўдзячным сродкам вобразнасці, сціслага выкладу думак. Так, у вершы “Вузел” выкарыстана легенда пра *гордзіеў вузел,* нібы які Аляксандр Македонскі ў 334 г. да н. э. рассёк мячом.

Адно я знаю: гэткі меч
На свеце не скуецца,
Каб мог ён вузел мой рассеч,
Не закрануўшы сэрца [1, с. 61].

Фрыгійскі цар Гордзій прывязаў заблытаным вузлом ярмо да дышла. Прадказанне аракула абвяшчала, што светам будзе валодаць той, хто развяжа вузел. Паэт ставіць задачу з іншай умовай і сам жа вырашае яе: духоўная сувязь з родным краем не можа быць разарвана (рассечана) – яна ў аснове жыцця.

Тэксталагічны аналіз лірыкі А. Пысіна дапамагае лепш зразумець сэнс асобных вобразных малюнкаў твораў, раскрывае патэнцыяльныя магчымасці слоўнікавага складу мовы для ўдасканалення гармоніі ідэальнага і матэрыяльнага ў сферы паэзіі. Чытаючы і перачытваючы вершы паэта, зноў і зноў міжволі здзіўляешся ўменню майстра лаканічна перадаць напружанасць падзей, сцісла апісаць адчуванні, навакольныя праявы свету, жыцця. Аналіз тэкстаў вершаў паказвае ўважлівы клопат паэта пра дакладнасць слова ў яго паэзіі. Многія сціслыя вобразныя выказванні А. Пысіна лёгка запамінаюцца, яны эмацыянальна-ўражлівыя і могуць успрымацца як крылатыя выслоўі. Змест разгледжаных твораў А. Пысіна, характар іх лінгвістычнай інтэрпарэтацыі маюць важнае значэнне

МГПУ им. И.П. Шамякина

ў плане выхавання ў студэнтаў (навучэнцаў) пачуцця патрыятызму, маральных каштоўнасцей і іншых станоўчых якасцей асобы. Вывучнне яго твораў дапамагае ўбачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Пысін, А. Збор твораў : у 2 т. / А. Пысін. – Мн. : Выш. школа, 1989. – Т. 1: Вершы. – 399 с.
2. Шпакоўскі, І. С. Узрушанасць: Артыкулы пра сучасную беларускую паэзію / І. С. Шпакоўскі. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1978. – 173 с.


## ДУХОВНО-НРАВСТВЕННОЕ И ГРАЖДАНСКО-ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ В ГУО «СРЕДНЯЯ ШКОЛА № 2 Г. ПОСТАВЫ ИМЕНИ Н.М. ОСЕНЕНКО


**Прокопович Н.Ф., ГУО «Средняя школа № 2 г. Поставы имени Н.М. Осененко»**


В настоящее время Беларусь выстраивает новую образовательную стратегию, основанную на духовных традициях. Именно поэтому в школах проводятся факультативные занятия «Основы духовно-нравственной культуры и патриотизма». Однако даже в духовно-нравственном и гражданско-патриотическом образовании часто транслируем информацию и знания, а не передаём духовный опыт. А ведь образование в первоначальном значении – это попытка человека приобрести образ Божий. Слово «образование» происходит от слова «образ», «икона». В белорусском языке иконы называют «абразамі».

В учреждении образования «Средняя школа № 2 г. Поставы имени Н.М. Осененко» заботятся, прежде всего, о духовном интеллекте. Духовный интеллект – это осознание и понимание смысла земной жизни, как подготовки к жизни вечной. Духовный интеллект – это умение проявлять сострадание и милосердие, способность видеть глубинные связи между явлениями, ценить красоту мира и стремиться к гармонии с самим собой и окружающими людьми, умение найти спокойствие даже в самых трудных жизненных ситуациях. Развивая духовный интеллект, мы становимся более целостными и счастливыми людьми, способными приносить добро и свет.

Следует отметить, что в школе стараются развивать духовный интеллект не на словах, а на деле, на собственном примере. Согласитесь, что взрослые часто говорят детям, а не говорят с детьми. Иногда взрослые хотят передать детям то, чего нет у нас самих по принципу «Делай так, как я говорю, а не так, как я делаю» и удивляются, почему «правильные» слова пропускаются мимо ушей, а копируется поведение.

Развитие духовного интеллекта в школе основывается на трёх «китах»: краеведение, личный опыт, медиаграмотность. Первое направление – традиции и краеведение. В учреждении образования проводится системная работа по сбору и обработке материалов по изучению родного края и передаче знаний местным жителям, особенно молодому поколению. Мы стараемся погружаться в культуру и историю своего народа, изучать традиции, прежде всего православные традиции. Собранные материалы используются на факультативных занятиях «Основы духовно-нравственной культуры и патриотизма». Об уровне материалов свидетельствует тот факт, что фильм «Святыни Поставского края» был отмечен на республиканском уровне. В мае 2024 г. учащиеся школы получили диплом I степени на Кирилло-Мефодиевских чтениях.

Личность формируется временем и местом, где мы живем (нашей культурой). Но часто бывает удивительно видеть, насколько схожи проблемы, с которыми сталкивались люди в прошлом, с современными проблемами. Традиция оказывает огромное влияние на мировоззрение и поведение. Традиционными в школе стали благотворительные акции, совместное с родителями празднование Пасхи Христовой,

МГПУ им. И.П. Шамякина